Назва ТВП: Лебядзіны мох

© С. Левый

Код: BY032

Геаграфічныя каардынаты: 55°45' N 29°10' E

Адміністрацыйная прыналежнасць: Віцебская вобласць: Полацкі раён, Расонскі раён

Плошча: 25894 га

Крытэрыі: B2

Нацыянальны прыродаахоўны статус: не мае

Міжнародны прыродаахоўны статус: ТВП рэгіянальнай значнасці

Агульнае апісанне:

Угоддзе ўяўляе сабой адзіны леса-балотны масіў на плоскай водападзельнай раўніне. Рэльеф на поўначы і на паўночным захадзе ўскладнён шматлікімі мацерыковымі дзюнамі.

Па структуры расліннага покрыва тэрыторыя з’яўляецца пераважна лясной. Тут растуць сасновыя, яловыя, асінавыя, альховыя і бярозавыя лясы. Прыродаахоўную каштоўнасць тэрыторыі прыдаюць вялікія масівы верхавых балот з градава-мачажыннымі комплексамі і маляўнічымі азёрамі, а таксама парослыя хвоямі дзюны. Забалочаныя нізіны пакрыты яловымі і дробналісцёвымі лясамі. Поймы рэк параслі лазнякамі і алешнікамі. У складзе флоры ўгоддзя адзначана 8

відаў раслін, занесеных у Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь. Акрамя гэтага тут сустракаюцца вярба лапландская *Salix lapponum*, бяроза нізкая *Betula humilis*, плывунец прамежкавы *Utricularia intermedia*, занесеныя ў Спіс прафілактычнай аховы Чырвонай кнігі Рэспублікі Беларусь.

Сярод балот пераважаюць верхавыя і пераходныя. У поймах рэк і па перыферыі верхавых балот знаходзяцца ўчасткі балот нізіннага тыпу. Сярэдняя глыбіня тарфяной залежы складае 0,5-2 м.

Гідралагічная сетка добра развіта і прадстаўлена вялікай колькасцю малых рэк і азёр. Найбольш буйныя рэкі – Дрыса і яе прытокі Вядзеціца і Марынец. Поймы гэтых рэк моцна забалочаны, шырыня рэчышчаў складае 2-4 м, глыбіня 0,5-1,5 м, берагі нізкія, гразкія. На тэрыторыі ўгоддзя знаходзіцца больш за 20 азёр, самае буйное з якіх – возера Вядзета.

Паколькі тэрыторыя доўгі час выкарыстоўвалася ў якасці ваеннага палігона, жыхароў населеных пунктаў, якія былі тут раней, адсялілі, а самі населеныя пункты знеслі. Гэта абумовіла практычна поўную адсутнасць у межах палігона сельскагаспадарчых зямель. Асноўнае сучаснае выкарыстанне тэрыторыі – вядзенне лясной гаспадаркі. Леса-балотныя ўгоддзі выкарыстоўваюцца таксама і для палявання. На шматлікіх дробных азёрах вядзецца аматарская лоўля рыбы, а на азёрах Вядзета і Глыбочына – прамысловае рыбалоўства. У лясах мясцовае насельніцтва збірае грыбы і ягады, лекавыя расліны.

Асноўныя біятопы:

Лясы (пераважна хваёвыя) – 55%, балоты верхавыя – 37%, азёры – 7%, іншыя землі – 1%.

Птушкі:

Высокая мазаічнасць ландшафтаў і цяжкадаступнасць угоддзя вызначаюць яго багатую фаўністычную разнастайнасць. Лебядзіны Мох з’яўляецца важным месцам гнездавання для цэлага шэрагу рэдкіх і ахоўваемых птушак.

З птушак, занесеных у Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь на гнездаванні адзначаны чорнаваллёвы гагач *Gavia arctica*, вялікі бугай *Botaurus stellaris*, чорны бусел *Ciconia nigra*, скапа *Pandion haliaetus*, малы арлец *Aquila pomarina*, арол-маркут *Aquila chrysaetos*, пардва *Lagopus lagopus*, шэры журавель *Grus grus*, дубальт *Gallinsgo media*, залацістая сеўка *Pluvialis apricaria*, сярэдні *Numenius phaeopus*

і вялікі *Numenius arquata* кулёны, вялікі грыцук *Limosa limosa*, пугач *Bubo bubo*, балотная сава *Asio flammeus*, вераб’іны сычык *Glaucidium passerinum*, жоўтагаловы дзяцел *Picoides tridactylus*. Балота Лебядзіны Мох мае вялікае значэнне як аднаўленчы цэнтр глушца *Tetrao urogallus*: тут яшчэ не рэдкасць такі, на якіх збіраюцца па 20 і больш птушак.

Іншыя групы жывел:

Найбольш звычайныя прадстаўнікі капытных – лось *Alces alces*, дзік *Sus scrofa* і казуля *Capreolus capreolus*, з буйных драпежнікаў адзначаны лісіца *Vulpes vulpes* і воўк *Canis lupus*, даволі шматлікі янотападобны сабака *Nyctereutes procyonoides*. З куніцавых з высокай шчыльнасцю жывуць куніца лясная *Martes martes*, норка амерыканская *Mustela vison*, ласка *Mustela nivalis*, гарнастай *Mustela erminea*. У рэках і азёрах сустракаецца выдра *Lutra lutra*, шматлікі бабёр рачны *Castor fiber*. Гэта тэрыторыя – адно з нямногіх месцаў у Беларусі, дзе пастаянна жывуць рысь *Lynx lynx* і буры мядзведзь *Ursus arctos*, колькасць якіх па дадзеных зімовых улікаў 2002 года склала 5-7 і 4 асобіны адпаведна.

Стан рэдкіх відаў птушак:

Віды	Статус	Колькасць	Год/перыяд ацэнкі	Дакладнасць ацэнкі	Трэнды (2005-2010)	Крытерый ТВП
Пардва *Lagopus lagopus*	гн	+	2005-2010	П		
Гагач чорнаваллёвы *Gavia arctica*	гн	2-3 п	2005-2010	Д		
Чапля-бугай *Botaurus stellaris*	гн	3-4 п	2005-2010	Д		
Чорны бусел *Ciconia nigra*	гн	3-4 п	2005-2010	Д		

Віды	Статус	Колькасць	Год/перыяд ацэнкі	Дакладнасць ацэнкі	Трэнды (2005-2010)	Крытерый ТВП
Арлан-белахвост *Haliaeetus albicilla*	гн	1-2 п	2005-2010	Д		
Малы арлец *Aquila pomarina*	гн	5-6 п	2005-2010	Д		
Арол-маркут *Aquila chrysaetos*	гн	1 п	2005-2010	Д	↔	
Скапа *Pandion haliaetus*	гн	5 п	2005-2010	Д	↔	B2
Драч *Crex crex*	гн	+	2005-2010	П		
Сеўка залацістая *Pluvialis apricaria*	гн	+	2005-2010	П		
Дубальт *Gallinago media*	гн	+	2005-2010	П		
Грыцук вялікі *Limosa limosa*	гн	+	2005-2010	П		
Кулён сярэдні *Numenius phaeopus*	гн	+	2005-2010	П		
Кулён вялікі *Numenius arquata*	гн	+	2005-2010	П		
Пугач *Bubo bubo*	гн	+	2005-2010	П		

Віды	Статус	Колькасць	Год/перыяд ацэнкі	Дакладнасць ацэнкі	Трэнды (2005-2010)	Крытерый ТВП
Сычык вераб’іны *Glaucidium passerinum*	гн	+	2005-2010	П		
Кугакаўка даўгахвостая *Strix uralensis*	гн	5-7 п	2005-2010	Д		
Сава балотная *Asio flammeus*	гн	+	2005-2010	П		
Дзяцел жоўтагаловы *Picoides tridactylus*	гн	+	2005-2010	П		

Іншыя рэдкія і знаходзячыеся пад пагрозай знікнення віды:

Расліны: баранец звычайны *Huperzia selago*, ліннэя паўночная *Linnaea borealis*, тайник яйцападобны *Listera ovata*, асака заліваемая *Carex paupercula*, вярба чарнічная *Salix myrtylloides*, марошка *Rubus chamaemorus*, журавіны дробнаплодныя *Oxycoccus microcarpus*, падвей стройны *Eriophorum gracile*.

Пагрозы:

Асноўнымі неспрыяльнымі фактарамі з’яўляюцца высечкі лесу і лясныя пажары.

Высечкі лесу па прычынах высокай забалочанасці тэрыторыі і слаба развітай дарожнай сеткі носяць абмежаваны характар. Тым не менш, захоўваецца пагроза высечкі старых лясоў па ўскраінах балот і градах, якія з’яўляюцца месцамі пражывання рэдкіх відаў жывёл.

Лясныя пажары ўяўляюць сабой адзін з найбольш істотных фактараў пагрозы. Пажары на цяжкадаступных тарфяных балотах ў засушлівыя гады практычна немагчыма патушыць. Так, спякотным летам 2002 года на ўсходзе балотнага

масіва Лебядзіны Мох выгарэла каля 200 га лесу, а пажар на тарфяніку ўдалося патушыць толькі з пачаткам інтэнсіўных асенніх дажджоў.

Рэкамендацыі па захаванню:

З мэтай рэгламентавання гаспадарчай дзейнасці неабходна стварыць рэспубліканскі ландшафтны заказнік і распрацаваць шматгадовы план кіравання.

Крыніцы інфармацыі:

Асабістыя паведамленні: Іваноўскі У.В.

Скарбы прыроды Беларусі. – Мн.: Беларусь, 2005. – 215 с. (Інфармацыю падрыхтавалі: Іваноўскі У.В., Максіменкаў М.В., Скуратовіч А.М., Навіцкі Р.В.)

Складальнікі : Іваноўскі У.В.

---

* *Выкарыстанне змешчанай тут неапублікаванай інфармацыі для навуковых публікацый без пісьмовай згоды яе аўтараў забаронена. У выпадку выкарыстання часткі кантэнту або старонкі цалкам на іншых інтэрнет-рэсурсах, абавязковая спасылка на аўтараў і сайт iba.ptushki.org*